культурнай прасторы ўплывалі: а) абумоўленасць артэфактаў яе этнамастацтва (з моцнымі фальклорнымі каранямі) асаблівасцямі перыядаў старажытнай гісторыі і геаграфічным становішчам Беларусі; б) далучанасць тэрыторыі Беларусі з часоў Сярэднявечча да ўсіх стадый развіцця еўрапейскага мастацтва, якая забяспечыла вялікую колькасць якасных артэфактаў прыгожых мастацтваў мясцовага паходжання. Паколькі сёння беларускі этнаскладнік у мастацка-культурнай прасторы прадстаўлены відавочна недастаткова, яе фальклярызацыя – патрэба часу.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Казанина, В.* Арт-рынок антикварных произведений искусства Беларуси как система: генезис и актуальные приоритеты формирования целостности / В. Казанина // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / нав. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2017. – Вып. 23. – С. 301 – 307.

# ЭТНАМАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ

**Этнамастацкая адукацыя** (ад *ст.-грэч.* ἔθνος – народ і *лац.* educatio – выхаванне) – *набыццё грамадска-карысных ведаў, уменняў і навыкаў сродкамі азнаямлення з узорамі народнага мастацтва свайго этнасу.* Пад уплывам фальклорнага руху канца XX стагоддзя ў Расіі, Украіне, Беларусі, Прыбалтыцы, Закаўказзі, Сярэдняй Азіі на мяжы XX – XXI стагоддзяў з'явіліся «народныя» аддзяленні ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, дзе матэрыяльнае і вуснае народнае мастацтва павінна была з'яўляцца мэтай і зместам навучання. У межах іх дзейнасці была ажыццяўлена спроба «вывесці селекцыйна» пераемнікаў народнага мастацтва этнасаў былога СССР. Праз акадэмічны абмен у Беларусі з'явіўся шэраг выкладчыкаў-народнікаў, у тым ліку Н. Лаўрухіна (народны танец) і Л. Снапкова (спевы). Частка «народных» аддзяленняў паступова акадэмізавалася і страціла кантакты з аўтэнтычным народным мастацтвам, частка – захавала непасрэдную сувязь з мастацкай аўтэнтыкай свайго народа. Наколькі жыццястойкім будзе вынік этнамастацкай адукацыі ў Еўразіі, пакажа рэчаіснасць XXI стагоддзя.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору: вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – С. 45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ